дзе возера дрэмле,
ліле́і цвітуць
і белыя лебедзі
вольна жывуць.

*Е. Лось.*

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія называюць прадметы.

## Прыназоўнік

### Успомніце з урокаў рускай мовы

Як называюцца словы, якія служаць для сувязі слоў у сказе?

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| прыназоўнік | предлог |

**160.** Разгледзьце малюнкі. Дзе сядзіць кот?



Кот сядзіць … дрэве.

Кот сядзіць … дрэвам.



Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб іх сэнс стаў зразумелым.

Для чаго служыць прыназоўнік у сказе?



Правообладатель Национальный институт образования

Прыназоўнікі ***у, на, над, з, за, з-за, да, ад, па, пад*** служаць для сувязі слоў у сказе. Яны пішуцца асобна ад іншых слоў у сказе: *Унук паехаў да бабулі.*

Рм **161.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Якая пара года на ёй адлюстравана?



Адкажыце на пытанні, выкарыстайце словы для даведкі.

Што паказалася **з-за** воблакаў?
**Ад** чаго вызвалілася рэчка?
Дзе яшчэ ляжыць снег?
Што прабіваецца з зямлі?



Правообладатель Национальный институт образования

С л о в ы   д л я   д а в е д к і: *ад лёду, сонейка, на палях, першая траўка.*

Адказы запішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**162.** Прачытайце. Чаму так гавораць?

Сакавік з в..дой, красавік з трав..й, май з кветкамі.

У сакавіку куры нап..юцца з лужыны.

Спішыце сказы. Устаўце патрэбныя літары або знак, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце прыназоўнікі.

## Гаварыце правільна

прыйсці са школы

пайсці ў *(па)* грыбы, пайсці ў *(па)* ягады

**163.** Адкажыце на пытанні.

| | |
|---|---|
| Куды мама ходзіць па ягады? | *з татам* |
| З кім ты любіш хадзіць у грыбы? | *з мамай* |
| | *на рынак* |
| | *з бабуляй* |

Адзін з адказаў запішыце. Падкрэсліце ў сказе прыназоўнікі.



Правообладатель Национальный институт образования



**164.** Прачытайце, спішыце. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Засп*(е/я)*ваў жаваранак. З лесу павеяла хала*(д/т)*ком. Узышло на небе сонца.

## Словы, якія называюць прыметы прадметаў

**165.** Падбярыце да слоў-назваў іх прыметы.

| | |
|---|---|
| Журавіны | *круглы, румяны, салодкі, сакавіты* |
| Вавёрка | *вялікае, глыбокае, празрыстае, блакітнае* |
| Яблык | *рыжая, маленькая, жвавая, пушыстая* |
| Возера | *буйныя, чырвоныя, кіслыя, карысныя* |

Ад слоў левага слупка пастаўце пытанні да слоў правага слупка.

Запішыце, якім бывае яблык.



Правообладатель Национальный институт образования